Дапамога

# КАРЫСНЫ ТЫДЗЕНЬ

**Дзённы цэнтр Чырвонага Крыжа ў Гродне для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі арганізаваў VIII інтэграцыйны лагер для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю. У лагеры дзеці могуць знайсці новых сяброў, а іх бацькі — адпачыць ад паўсядзённых бытавых праблем.**

Лагер працуе з 15 да 21 жніўня ў аграсядзібе «Каралінскі фальварак Тызенгаўза», размешчанай у маляўнічым месцы за некалькі кіламетраў ад абласнога цэнтра.

— Да ўдзелу мы запрасілі актыўных бацькоў з асаблівымі дзецьмі з ліку сем'яў, якія найбольш маюць патрэбу ў падтрымцы, — патлумачыла **кіраўнік Цэнтра для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі Гродзенскай гарадской арганізацыі БТЧК Інеса ЛАРЫЁНАВА.**

Кожны дзень у лагеры распісаны па гадзінах. Пачынаецца ён з зарадкі і заканчваецца дыскатэкай. На працягу тыдня праходзяць розныя трэнінгі, у тым ліку па навучанні першай дапамозе і здароваму ладу жыцця, псіхасацыяльнай падтрымцы, абілітацыі, а таксама майстар-класы, квэсты, заняткі ёгай, гульні на свежым паветры, творчыя конкурсы і іншае.

Валанцёры Чырвонага Крыжа праводзяць для ўдзельнікаў лагера ўводны навучальны курс гісторыі руху. Магчыма, хтосьці з удзельнікаў захоча далучыцца і дапамагаць іншым па прынцыпе «роўны — роўнаму», а валанцёры і супрацоўнікі Чырвонага Крыжа падчас змены будуць дапамагаць бацькам у доглядзе дзяцей.

Знаходжанне дарослых і дзяцей на адпачынку праходзіць з захаваннем санітарна-супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў. Дзякуючы падтрымцы Галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама арганізавана правядзенне экспрэс-тэсціравання на каранавірусную інфекцыю ўсіх удзельнікаў лагера.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Сямейны капітал

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ДАКАЗАНА

**Для шматдзетных сем'яў адкрыта ўжо больш за 100 тысяч дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал», паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Так, на 1 жніўня 2021 года адкрыта ўжо 102 250 дэпазітных рахункаў.**

Па праграме «Сямейны капітал» 2015—2019 гадоў для шматдзетных сем'яў адкрыта 82 427 дэпазітных рахункаў на суму 824,3 мільёна долараў.

Памер прызначанай у мінулую пяцігодку сумы складаў 10 тысяч долараў у эквіваленце для шматдзетных сем'яў, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўлена, удачарона) у перыяд з 1 студзеня 2015 года да 31 снежня 2019 года ўключна. Звярнуцца па прызначэнне сямейнага капіталу можна было да 30 чэрвеня 2020 года ўключна — не пазней за шэсць месяцаў з дня нараджэння (усынаўлення, удачарэння) трэцяга дзіцяці або наступных дзяцей.

Па праграме 2020—2024 гадоў для шматдзетных сем'яў адкрыта 19 823 дэпазітныя рахункі на суму Br452,5 мільёна. У новай пяцігодцы сямейны капітал прызначаецца шматдзетным сем'ям, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўлена, удачарона) з 1 студзеня 2020 года да 31 снежня 2024 года ўключна. У 2020 годзе памер сямейнага капіталу складаў Br22,5 тысячы, а з 1 студзеня 2021 года павысіўся да Br23 737,5.

Вядома, што сродкамі сямейнага капіталу можна распарадзіцца датэрмінова. На 1 жніўня гэтага года на датэрміновае распараджэнне сродкамі пададзена 40 189 заяў. З іх на паляпшэнне жыллёвых умоў — 35 842 (89 %), на атрыманне адукацыі — 1811 (5 %), на атрыманне медыцынскіх паслуг — 2536 (6 %). Прынята 38 067 рашэнняў аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу.

Дарэчы, вынікі першай пяцігадовай праграмы сямейнага капіталу даказалі яе эфектыўнасць. Тэмп росту колькасці дзяцей, народжаных трэцімі і наступнымі за перыяд праграмы, склаў 140 працэнтаў у параўнанні з перыядам 2010—2014 гадоў.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Ёсць пытанне

# ДАБРЫНЯ СУПРАЦЬ БУЛІНГУ

## У беларускіх школах будуюць сяброўскае асяроддзе

**Праект, скіраваны на змяншэнне ў школах колькасці канфліктаў сярод вучняў і прадухіленне сітуацыі булінгу і фізічнага і псіхалагічнага ціску, працуе ўжо год. Апрабаваная ў Харватыі, Сербіі, Чарнагорыі і Балгарыі мадэль дапамагла напалову зменшыць узровень гвалту ва ўстановах гэтых краін, а булінг — на тры чвэрці. Пра выніку ўкаранення ў Беларусі харвацкай мадэлі, якую ў межах эксперымента на працягу пяці гадоў рэалізоўваюць у 26 школах краіны Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) і Міністэрства адукацыі, расказалі эксперты.**




### Камфортны клімат для ўсіх

Мэта праекта па стварэнні мадэлі «Сяброўскае і падтрымліваючае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі», які будзе ўкараняцца ў айчынных школах да 2025 года, — зрабіць псіхалагічныя ўмовы для навучання школьнікаў як мага больш спрыяльнымі. Прынамсі, вялікую працу па адаптацыі мадэлі правялі спецыялісты Інстытута псіхалогіі БДПУ і Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі БДПУ, заўважыў **Аляксандр ЖУК, рэктар БДПУ:**

*— Распрацаваны дапаможнік для педработнікаў школ. Па праграме «Бяспечнае і падтрымліваючае асяроддзе ў школах» абучаны ментары і спецыялісты сацыяльна-псіхалагічных службаў, а сама яна пратэсціравана ў пяці школах. Беларуская версія праграмы прэзентавана для дзяржаўных устаноў адукацыі — для магчымага ўключэння асобных модуляў у праграмы падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі педработнікаў.*

Вынікі праекта арганізатары бачаць у фарміраванні ўзаемнай павагі ў вучняў, устаноўцы сістэмы правіл і маніторынгу іх выканання. Чакаецца, што ў працэс прафілактыкі гвалту сярод аднагодкаў уключацца бацькі, настаўнікі і мясцовыя ўлады. Мяркуецца таксама, што ва ўстановах адукацыі будзе створаны камфортны клімат для ўсіх. Праект важны таксама для аднаўлення педагагічнай адукацыі ў краіне ў галіне ўстойлівага развіцця да 2030 года, упэўнены рэктар:

*— Місія ўніверсітэтаў — падрыхтаваць педагогаў, якія змогуць выхаваць моладзь з гуманістычным светапоглядам, крытычным, сацыяльна і экалагічна арыентаваным мысленнем і актыўнай грамадскай пазіцыяй. Рэаліі патрабуюць стварэння сяброўскіх дзіцяча-дарослых супольнасцяў як галоўнага механізму фарміравання новых сацыяльных практык у адукацыйнай прасторы.*

Падчас другога года дзеяння праграмы, якая распачата ў 2000-м, мяркуецца замацаваць напрацаваныя вынікі, а на трэці — далучыць да эксперымента новыя школы, падкрэслівае **Алена ГАЛАЎНЁВА, намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі:**

*— Міністэрства мае на мэце стварэнне бяспечнага і сяброўскага асяроддзя ў школе для кожнага дзіцяці, незалежна ад асаблівасцяў яго псіхафізічнага развіцця і ўзроўню ведаў. Будзе ўдасканальвацца работа з ментарамі і павялічвацца іх колькасць. Мэтазгодна, пэўна, унутры кожнай установы гадаваць свайго ментара, незалежна ад яго пасады. Галоўнае, каб да яго са сваёй праблемай мог падысці кожны навучэнец.*

### Амбіцыйныя планы

Напачатку былі амбіцыйныя планы пачаць рэалізацыю праекта адразу ў сотні беларускіх школ у першы ж год, аднак немагчыма было знайсці столькі валанцёраў для работы, заўважыла **Таня РАДАЧАЙ, прадстаўнік ЮНІСЕФ у Беларусі.** Акрамя таго, многія проста не верылі, што булінг — сур'ёзная праблема, ці папросту закрывалі на гэта вочы. Аднак знайшліся школьнікі, якіх вельмі зацікавіла гэтая праблема, і якія з ёй сутыкаліся, і якім трэба было дапамагчы справіцца з праявамі стыгматызацыі. Давялося працаваць і з бацькамі, дзеці якіх сутыкаліся з булінгам і цкаваннем і якія дапускалі памылкі ў вырашэнні гэтых праблем.

*— Важна паўтараць назапашаныя і створаныя практыкі з году ў год, каб дасягнуць станоўчых вынікаў у супрацьдзеянні гвалту з кожным новым пакаленнем вучняў і настаўнікаў.*

Яна выказала спадзяванне, што ў Беларусі будзе створана адаптаваная мадэль, якая пасля будзе прымяняцца ў большай колькасці школ.

*— Аднак не існуе ідэальных парад для розных сітуацый, таму неабходна рыхтавацца да таго, што заўжды трэба будзе ствараць нешта новае для вырашэння праблем, з якімі будуць сутыкацца дзеці і ў рэальным свеце, і ў анлайн-прасторы. І трэба навучыць дзяцей расказваць пра праблемы, якія з інтэрнэтных пераходзяць у рэальнае асяроддзе, і добра, калі ў школе і дома ёсць людзі, якім яны могуць давяраць. Год, за які рэалізоўваецца праект, ужо паказаў, з якімі праблемамі ў адносінах рэальна сутыкаюцца школьнікі і ментары.*

### «Дыягностыка» пытання

Сем крокаў харвацкай мадэлі айчынныя спецыялісты перапрацавалі пад беларускія рэаліі. Вельмі важна было вызначыць сэнс ідэі для яе паспяховай рэалізацыі, расказала пра работу над айчыннай мадэллю праекта **Ала МУЗЫЧЭНКА, загадчык кафедры псіхалогіі адукацыі і развіцця асобы Інстытута псіхалогіі БДПУ, кіраўнік праекта.**

Важна было ўсё: і падрыхтоўка рэкламнай прадукцыі для візуалізацыі прасторы ў школах, каб яна не стала проста звыклай выявай, якая не мае сэнсавай нагрузкі, і значкі, якія транслююць ідэю таго, што сіла ў дабрыні. Да мерапрыемстваў далучалі і выпускнікоў школ, якія ўжо з пункту гледжання бацькоў выказвалі свае думкі і бачанне праблемы.

*— З дапамогай ЮНІСЕФ ментары і валанцёры (старшакласнікі гэтых жа школ) праводзілі адкрытыя ўрокі на тэму супрацьдзеяння булінгу па прынцыпе «роўны навучае роўнага». Правялі конкурс-трэнінг па тэхналогіі АПШЫФТ «Пошук рашэнняў для супрацьдзеяння булінгу ў школьным асяроддзі», дзе кожная школа прапанавала сваё бачанне прымянення інструментаў для вырашэння праблемы,* — расказала яна. — *Былі надрукаваны буклеты і распрацаваны метадычныя рэкамендацыі, як іх выкарыстоўваць, якія гульні і дыскусіі арганізаваць, каб перадаць інфармацыю іншым. Пазней праводзілі дыягностыку сітуацый і нават асобных навучэнцаў, якія аказаліся ў праблемным становішчы, каб вызначыць, каму дзіця гатовае давяраць, якія агрэсары ёсць у класе.*

### Якога полу агрэсар?

Праваднік ідэй праектаў у кожнай установе, дзе праходзіць эксперымент, — ментар, які, як правіла, не працуе ў школе, таму мае больш нейтральны і кампетэнтны погляд. Аднак ёсць і тыя, хто ведае працэс знутры і з'яўляецца не знешнім, а ўнутраным ментарам. З такіх — **Людміла ЖУКОЎСКАЯ, педагог-псіхолаг сярэдняй школы № 125 г. Мінска:**

*— У ініцыятыўнай групе нашай школы восем педагогаў, кожны з якіх склаў індывідуальны план работы ў межах праекта. Трэба было патлумачыць і расказаць усяму калектыву школы пра рэалізацыю праекта. Трэба было прыцягнуць таксама ўсіх класных кіраўнікоў, а яшчэ патлумачыць бацькам, што гэта за праект. А стаўленне апошніх да школы вельмі рознае. Ёсць нават тыя, хто ўпэўнены: менавіта школа — галоўны булер, і праблемы ўзнікаюць менавіта тут, незалежна ад сітуацыі ў сям'і.*

На старце праграмы шляхам анкетавання 201 навучэнца (сярод жадаючых) 5—9-х класаў (124 хлопчыкі і 77 дзяўчынак) даследавалі актуальны стан суполкі навучэнцаў школы. Па выніках атрымалася, што ў школе 26 % агрэсараў (большасць хлопчыкі) і 6 % ахвяр.

*— Такі паказчык — прыкладна адзін агрэсар на клас, што не так і кепска, аднак паказвае, што прафілактыка булінгу — найлепшая мера. Штомесяц работу абагульнялі. Плюс быў у тым, што я магла звярнуцца ў любы час да бацькоў і настаўнікаў, мінус — у тым, што некаторыя намагаліся перакласці ўсю работу на мяне.*

За год правялі шмат трэнінгаў з настаўнікамі, заняткаў па фарміраванні адэкватнай самаацэнкі і развіцці талерантнасці і самапазнання з вучнямі 5—10-х класаў.

Напрыканцы года правялі паўторнае анкетаванне ўжо сярод 402 вучняў: 226 хлопчыкаў і 176 дзяўчынак. Асобна былі адабраныя падлеткі, якія паказалі агрэсіўныя і змешаныя паводзіны ў папярэднім даследаванні (82 чалавекі ва ўзросце ад 11 да 15 гадоў: 21 дзяўчынка, 61 хлопчык). Атрымалася, што агрэсарамі паказалі сябе 57 % дзяўчынак і 58 % хлопчыкаў, так што гендарная прыналежнасць ролі не іграе, падсумавала ментар.

Каб разам справіцца з булінгам, трэба каб школьнікі, настаўнікі і бацькі не толькі разумелі праблему, але і хацелі ад яе пазбавіцца і палепшыць школьнае жыццё.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**